# ТВОРЧЫЯ ПАРТРЭТЫ РЭЖЫСЁРАЎ БЕЛАРУСКАГА РАДЫЁТЭАТРА: ІГАР ВАСІЛЬЕВІЧ ЛАПЦІНСКІ

У. А. Трапянок, Мінск, Беларусь

Афіцыйная гісторыя беларускага радыётэатра пачалася ў 1934 г., калі малады літаратар, рэдактар маладзёжнага вяшчання Беларускага радыё [3, с. 133] В. П. Палескі напісаў першую радыёп’есу «Радня», якая прысвячалася надзённым праблемам калгаснай вёскі, перыпетыям класавай барацьбы, што разгарнулася ў гады калектывізацыі. І хаця першая для радыё перадача драмы – фрагментаў інсцэніроўкі Ц. Гартнага «Чорт і Баба» [4, с. 290] – адбылася яшчэ ў 1928 г. падчас трансляцыі творчага вечара, прысвечанага айчыннаму мастацтву, пачатак летапісу радыётэатра Беларусі паклала з’яўленне арыгінальнай радыёп’есы. За больш чым 80 гадоў пастаўлены сотні радыёспектакляў, над якімі працавалі таленавітыя рэжысёры, чые імёны зафіксаваліся пераважна на плёнках і дысках. Адным з іх з’яўляецца Заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь, акцёр, рэжысёр Ігар Васільевіч Лапцінскі, які амаль паўстагоддзя свайго жыцця прысвяціў служэнню драме перад мікрафонам.

Наш артыкул, напісаны паводле перадач з фондаў Беларускага радыё, утрымлівае малавядомыя факты з біяграфіі артыста і дэманструе значнасць для радыё і ўсяго айчыннага драматычнага мастацтва асобы І. Лапцінскага.

Нарадзіўся артыст у Магілёве, вышэйшую адукацыю атрымаў у Беларускім тэатральна-мастацкім інстытуце ў Б. Мардвінава, вучня К. Станіслаўскага і У. Неміровіча-Данчанкі. Пасля заканчэння ВНУ ў 1951 г. Лапцінскага прынялі ў трупу Беларускага тэатра імя Я. Купалы. Артыст успамінаў: «Гэта быў тэатр перажывання. Гэта была не ігра, гэта было жыццё. Гэта быў тэатр вялікага Мастацтва. Кожны эпізод – гэта філігранна створаная праца. Ім (артыстам) было падуладна поўнае пераўвасабленне» [1]. У Купалаўскім тэатры Лапцінскі «выконваў ролі маладых герояў, характарныя… Лепшая роля ў тэатры – вострахарактарны вобраз пана Пэру ў спектаклі «Пані міністэрша» Б. Нушыча» [2, с. 11].

З 1951 г. пачалося творчае супрацоўніцтва І. Лапцінскага з Беларускім радыё. Галоўным рэжысёрам рэдакцыі ў той час быў П. А. Данілаў, які запрасіў маладога артыста. Пасля няўдалага дэбюта ў якасці вядучага Лапцінскі зразумеў, што радыё з’яўляецца справай сур’ёзнай, і ўжо ніколі не дазваляў сабе садзіцца да мікрафона без належнай падрыхтоўкі.

У 1950-я гг. радыё размяшчалася ў будынку па вуліцы Рэвалюцыйнай у Мінску. Ігар Васільевіч тады працаваў акцёрам, шмат быў задзейнічаны ў дзіцячай рэдакцыі і рэдакцыі літаратурна-драматычнага вяшчання. Першай акцёрскай работай стала роля француза, настаўніка танцаў Гільёма ў спектаклі «Салавей» паводле З. Бядулі. Мастацкі савет, які прымаў спектакль, высока ацаніў работу Лапцінскага. Пазней артыст выконваў ролі ў радыёпастаноўках «Макар Дубрава» (паводле А. Карнейчука), «Простая дзяўчына» (паводле К. Губарэвіча) і інш. [1].

Спасціжэнне сакрэтаў радыёмайстэрства адбывалася паэтапна. Ігар Васільевіч гаварыў, што праца перад мікрафонам – гэта ўменне чытаць не на ўсю вялікую аўдыторыю, як таго патрабуе тэатральная дзейнасць, а для нейкага канкрэтнага чалавека. «Я расказваю яму

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тое, што ў матэрыяле напісана. Гэта ўжо майстэрства акцёра: размаўляць з нябачным гледачом. Калі акцёр не мае патрэбы выказвацца – ён не акцёр» [1]. Складанасць радыё ў тым, што перад выканаўцамі адсутнічае рэальны глядач, няма дэкарацый, святла, адпаведна, атмасферу варта ствараць голасам, трэба выдумваць свайго гледача. Разам з тым, на радыё даступны вялікі рэпертуар, паколькі стварэнне вобразаў залежыць толькі ад асаблівасцей голасу. Са слоў артыста, праца над роляй на радыё амаль такая ж, як і ў тэатры. «Акцёр – як малое дзіця. Ён мусіць верыць у няпраўду як у праўду. Калі акцёр не паверыць у прапанаваныя абставіны, у тую няпраўду, якую напісаў драматург, ён не сыграе ролю. Акцёр – пракурор, абаронца, даследчык», – расказваў І. Лапцінскі [1].

У 1963 г., калі Беларускае радыё перамясцілася ў новы будынак на вуліцы Чырвонай, Ігар Васільевіч заняўся рэжысёрскай справай. У той час пасаду галоўнага рэдактара дзіцячай рэдакцыі займала В. Шапавалава, якая і запрасіла на працу ў рэдакцыю І. Лапцінскага, нягледзячы на тое, што ў рэжысёрскай камандзе былі мэтры М. Троіцкая, П. Данілаў, Т. Аляксеева. Дэбютам для рэжысёра стала ўвасабленне апавядання «Два Аляксандры». Апавяданне для радыё інсцэніравала рэдактар Б. Шарашэўская. На ролі ў спектаклі І. Лапцінскі запрасіў акцёраў В. Тарасава і Н. Аўчыннікаву. Упершыню для афармлення работы была выкарыстана гітарная музыка, з-за чаго рэдакцыя доўга не прымала спектакль. Лапцінскі адстаяў сваё творчае рашэнне, і такі смелы для пастаноўшчыка-пачаткоўцы крок прывёў Лапцінскага да высновы, што лёс рэжысёра заключаецца ў адстойванні ўласнай пазіцыі.

Сярод лепшых спектакляў, пастаўленых Ігарам Васільевічам, вылучаюцца «Палескія рабінзоны» паводле Я. Маўра, «Спартак» паводле рамана Р. Джаваньёлі, «Лясная крэпасць» М. Гамолкі, «Апошні дзень з жыцця Роберта Джордана» паводле Э. Хемінгуэя, «Мой генерал» А. Ліханава, «Лёс паэта» В. Шымука, «Дарога на дваіх», «Вяртанне да сябе», «Не праміні свой лёс» паводле М. Калошкі, «Лівень» паводле А. Жука, «Час дыназаўра» паводле Л. Шчэрбача, а таксама «Палескія вандроўнікі» паводле Г. Пашкова, за які ў 1998 г. творчай камандзе на чале з І. Лапцінскім уручана Дзяржаўная прэмія Беларусі [2, с. 11]. Сярод уласных пастановак адной з самых любімых і цікавых з пункту гледжання акцёрскіх работ Ігар Васільевіч назваў спектакль «Жаніцьба» паводле І. Шальманава. Ролю Хведара Бірука выканаў артыст Ю. Авяр'янаў, Алену Лук'янчык сыграла артыстка Т. Мархель, рэжысёр выступіў яшчэ ў ролі Вядучага. Ігар Васільевіч шмат запісваўся з акцёрамі П. Дубашынскім, М. Захарэвіч, Г. Аўсяннікавым, В. Манаевым, В. Лабушам, А. Пастрэвіч, Н. Качатковай, Ю. Сідаравым, І. Курганам і інш.

Ігар Лапцінскі сцвярджаў, што прафесія рэжысёра вызначаецца арганізацыяй творчага працэсу для каманды ў складзе сцэнарыста, гукарэжысёра, гукааператараў, акцёраў. Плённым было супрацоўніцтва І. Лапцінскага з гукарэжысёрамі і гукааператарамі В. Красоўскім, Р. Донцысам, Г. Басько, Т. Сідаравай, С. Бязлюдавай, Т. Стыдаль, якія добра разумелі творчыя задумы рэжысёра і дапамагалі ўвасобіць іх у працы. Шмат якасных работ рэжысёр стварыў з гукарэжысёрам В. Красоўскім. «Толькі ў сумеснай працы можна дасягнуць вышынь. Наша мастацтва радыё – не для вуха, а для вока слухача, каб глядач убачыў тое, пра што ідзе гаворка», – гаварыў у інтэрв'ю І. Лапцінскі [1].

Ігар Васільевіч працаваў на радыё да пачатку 2000-х гг. Калі арыгінальных спектакляў выходзіла небагата, а перыяд заняпаду беларускага радыётэатра пачаўся ў другой палове 1990-х гг. і працягваўся да 2005 г., Лапцінскі займаўся рэстаўрацыяй фондавых пастановак, пераводам іх у аб'ёмнае (стэрэа) гучанне. «Многіх акцёраў няма, але галасы захаваліся. Аднаўленне – вялікая каштоўная праца. І самі спектаклі даюць магчымасць пазнаёміцца з тым часам, перыядам, у які запісаны», – гаварыў І. Лапцінскі [1].

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Рэжысёрская рука Ігара Васільевіча прыкладвалася і да цыклавых перадач мастацкага, публіцыстычнага, дакументальнага зместу. Варта прыгадаць праграмы «Ступені майго жыцця», «Розгалас», «Неўміручае і надзённае», «Акно ў свет», «Сьвяты той куточак», «Літаратурныя чытанні», «Напіцца з той крыніцы».

І. Лапцінскі ў інтэрв'ю з фондаў радыё прызнаўся: «Хочацца пасля сябе штосьці пакінуць, каб і пра цябе сказалі, што ты займаўся важнай справай. Хочацца, каб гэтую справу працягвалі» [1]. Пераемнікамі традыцый, закладзеных 8 дзесяцігоддзяў таму, сталі рэжысёры А. Вінярскі, Р. Патака, А. Пташук. І. Лапцінскі ў пачатку новага тысячагоддзя пераехаў на сталае месца жыхарства ў Канаду, там жа артыста не стала. Сёння працы рэжысёра захоўваюцца ў фондах Дома радыё і транслююцца ў эфіры двух каналаў Беларускага радыё – Першага нацыянальнага і канала «Культура».

- Літаратура


1. Архіў фондавых матэрыялаў Беларускага радыё за 1998 год. – Маэстра патрыярх [Творчы партрэт заслужанага артыста РБ, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі РБ І. Лапцінскага], М. Зарыцкі, перадача на плёнках 31264 – 31267 СТБ.

2. Бур'ян, Б. І. / Б. І. Бур'ян, І. В. Лапцінскі // Тэатральная энцыклапедыя: Энцыклапедыя : у 2 т. – Мінск : БелЭн, 2003. Т. 2: Лабанок – Яшчур / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]– С. 11.

3. Курков, И. Н. Белтелерадиокомпания. Мир живого эфира / И. Курков. – Минск : Медиафакт, 2007. – 304 с.

4. Шэін, В. М. Радыётэатр / В.М. Шэін // Тэатральная Беларусь: Энцыклапедыя : у 2 т. – Мінск : БелЭн, 2003. Т. 2: Лабанок – Яшчур / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – С. 290–291.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ